*Любоў Сівурава*

## МІЖПАКАЛЕННЫЯ СУВЯЗІ ЯК УМОВА ПЕРАЕМНАСЦІ МАСТАЦКІХ ТРАДЫЦЫЙ

У сучасным грамадстве адбываюцца эпахальныя змены, выліканыя працэсамі інтэграцыі і глабалізацыі. Пад іх уплывам абвастараецца пагроза знікнення этнічных асаблівасцяў традыцыйнай мастацкай культуры. У цяперашні час важна вывучаць яе фенаменалагічныя асаблівасці, заканамернасці іспавання і пераемнасці. Такія ўласцівасці традыцыйнай мастацкай культуры, якспалучэнне традыцыі і навацыі, вусная форма перадачы, інварыянтнасць, імправізацыйнасць. кардынальным чынам адрозніваюць яе ад пісьмовых форм культуры. Неабходна прааналізаваць ролю міжпакаленных сувязяў у працэсе пераемнасці мастацкай культуры.

Назапашванне мастацкага вопыту, ведаў і навыкаў працы з матэрыялам, удасканальванне тэхналогій адбываецца паступова, у працэсе доўгатэрміновай сістэмнай працы. Важную ролю адыгрывае творчае ўзаемадзеянне паміж майстрамі. Пры рамесніках заўжды фарміравалася кола вучняў, якія цягам супольнай з майстрамі дзейнасці асвойвалі сакрэты справы.

Лепшым спосабам для засваення рамесніцкіх тэхналогій з’яўляецца стварэннетворчых майстэрань, сумесныя з майстрамі вытворчыя заняткі. Жывы эмацыянальны кантакт з носьбітамі, атрыманне «з першых рук» песні, танца, спосабаў аздаблення адзення, дэкаратыўна-прыкладных відаў мастацтва, па-першае, з’яўляецца гарантыяй захавання сакрэтаў майстэрства і дакладнага засваення рамесніцкіх прыёмаў, спосабаў гуказдабывання, лексікі народнага танца і г.д., па-другое, аблягчае разуменне тэхналагічнага працэсу, па-трэцяе, карэктуе працэс навучання. Такім чынам, важнай перавагай вуснага спосабу навучання з’яўляецца нагляднасць і эмацыянальнасць непасрэдных зносінаў з майстрамі.

Калі сістэмныя стасункі з носьбітамі старэйшага пакалення немагчымыя, а навучанне вядзецца ва ўмовах адукацыйнай установы, вялікае значэнне маюць экспедыцыйныя вандроўкі да майстроў, гутаркі з імі, супольныя спеўныя, танцавальныя, рамесныя заняткі, удзел у абрадах у месцах іх бытавання.

Антаніна Абрамовіч, мастацкі кіраўнік фальклорнага ансамбля «Берагіня» Мётчанскай адукацыйна-выхаваўчай установы «Школа–садок» Барысаўскага раёна Мінскай вобласці, аналізуючы свой шматгадовы вопыт этнапедагагічнай дзейнасці, набыты ў працэсе рэалізацыі праграмы «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы адраджэння»(з 1996 года), піша: «Неацэннае выхаваўчае значэнне маюць кантакты дзяцей з носьбітамі народных традыцый — бабулямі і дзядулямі, якія здольны за час фальклорнай вандроўкі даць дзецям столькі гістарычных, сацыяльных і культуралагічных ведаў, што іх не змесціш і ў тоўсты падручнік. А яшчэ больш даюць яны душы дзіцяці: добрыя, мудрыя, інтэлігентныя па натуры, а не па адукацыі, бабулі і дзядулі выхоўваюць непрыкметна, неназойліва, бяскрыўдна — не так, як бывае часа на ўроках стомленых ад школы настаўнікаў» [1, с. 25].

Вялікае значэнне належыць выкананню абрадаў, рытуалаў, дзе перадача трыдыцый ажыццяўляецца ў асабліва ўрачыстай, вобразна-эмацыянальнай форме.Кіраўнік фальклорнага калектыву пры Гомельскай маладзёвай краязнаўчай грамадскай арганізацыі Ірына Глушэц зазначае: «Безумоўна, самы лепшы сродак навучання — спевы ў натуральных умовах разам з носьбітамі. Так, падчас абрадавага свята з’яўляецца патрэбны настрой, матывацыя.Калі на вуліцы ці ў полі ў час абраду выконваецца пэўны твор, спевакам становіцца зразумелая дынаміка песень, здымаецца псіхалагічнае напружанне, адцягваецца ўвага ад тэхнічных цяжкасцей выканання. Часта ў такіх абставінах чалавек і не заўважае, што даволі лёгка робіць тое, што яму здавалася недасягальным» [3, с. 144].

Аптымальнай умовай для ўстойлівай захаванасці мастацкіх традыцый з’яўлецца наяўнасць і мастацкая сувязь двух—трох пакаленняў — дзядоў, дзяцей і ўнукаў. Часавая адлегласць паміж пакаленнямі прыблізна 20—25 гадоў.У сваёй спалучанасці яны ўтвараюць ланцужок каля 70-ці гадоў. Для маладых і юных мастакоў 10—20 гадоў — час для развіцця і сталення пад клапатлівым позіркам настаўнікаў. Калі вучань набывае ўпэўненыя веды і навыкі, то з цягам часу сам можа перадаваць майстэрства сваім вучням.

Прыкладам захавальніцкай дзейнасці рэгіянальных традыцый з’яўляецца фальклорны калектыў «Голаса спадчыны» вёскі Багатырскае Полацкага раёна. Яго кіраўнік Вера Іванаўна Пісюкова. На сённяшні дзень у фальклорным гурце спяваюць 19 чалавек. Ёсць сямейныя дынастыі. Гэта Пісюковы — маці, сын, унукі. Крыху раней спявалі маці, дачка, унучка Стрэльчанкі. Старажылы калектыву — Ларыса Рабцава, Ганна Жаркова, Андрэй Пісюкоў, Таццяна Стараннік, Алена Каваленка, Галіна Бычкова, Алена Лугаўская, Людміла Касынкіна…[4].

Вялікае значэнне ў працэсе назапашвання, захавання і наладжвання працэса пераемнасці мае асоба майстра. Майстар вызначаецца ўнікальнымі здольнасцямі, адданасцю справе, педагагічным талентам. Вера Іванаўна ў калектыве сорак гадоў. Яна — самародак, вялікі талент. Валодае моцным, чыстым голасам. А песень колькі ведае, прыпевак, прыказак. У сям’і Веры Уладзіміраўны спявалі бабуля і маці. Яна — збіральніца песеннага і танцавальнага фальклору свайго рэгіёну. Займаецца вывучэннем, даследчай дзейнасцю і апрацоўкай фальклорнага матэрыялу, які потым выкарыстоўвае для сцэнічнага рэпертуару калектыву. З непасрэдным удзелам Веры Уладзіміраўны падрыхтавана фанатэка абрадавых песень, сабраных у вёсках Пазнякова, Дразды, Баяноўшчына, Скабы. Песні, танцы, звязаныя з традыцыйным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускім вяселлем, хрэсьбінамі, радзінамі, купальскія, жніўныя, рэкруцкія, любоўныя, жартоўныя, — аснова яе рэпертуару [4].

Для развіцця пераемнасці традыцый беларускай культуры быў створаны гурт-спадарожнік «Галаса спадчыны» — «Каласочкі». У яго рэпертуары песенна-танцавальныя ўзоры Полацкага рэгіёну — карагоды, песні, гульні, танцы.Сумесныя рэпетыцыі дапамагаюць дзецям трапіць у тое творчае асяроддзе, дзе выхоўваецца павага да сваіх каранёў, вытокаў беларускага фальклору [4].

Прыкладам таго, як фальклорныя традыцыі захоўваюцца і перадаюцца новаму пакаленню ва ўмовах адарванасці ад натуральных умоў бытавання, з'яўляецца дзейнасць фальклорнага гурта «Guda» (г. Мінск). Ён займаецца вывучэннем каляндарна-абрадавай і сямейна-абрадавай спеўнай культуры розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, узнаўленнем беларускай народна-песеннай спадчыны з максімальным захаваннем гукавой фактуры ва ўмовах вялікага горада.У ім спалучана два пакаленні спявачак. Старэйшыя — 40 – 45 гадовыя ўдзельніцы перадаюць прадстаўнікам новага складу, якім 22 – 26 гадоў, свой мастацкі вопыт, рэпертуар, традыцыі, дапамагаюць развіць музычны слых, голас, выканальніцкія здольнасці, далучаюць да канцэртна-гастрольнай дзейнасці [3].

Важна, каб працэс міжпакаленнай перадачы меў выражэнне не толькі штодзеннай творчай дзейнасці мастацкіх калектываў, майстэрань, гурткоў. Гэта думка мусіць стаць канцэптуальнай асновай буйных мастацкіх акцый — фестываляў, святаў, кірмашоў.

Менавіта на ідэйным падмурку яднання пакаленняў плануецца правесці ў 2013 годзе ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту фестываль фальклорнага мастацтва«Сонцаварот» (аўтар праекта — К. Петраневіч). Адной з задач фестывалю з'яўляецца наладжванне міжпакаленных сувязяў паміж носьбітамі і спадкаемцамі фальклорных традыцый. Для дасягнення пастаўленай задачы да ўдзелу ў фестывалі запрашаюцца аўтэнтычныя гурты, сямейныя ансамблі, салісты – вакалісты, танцоры, музыканты, фальклорныя калектывы другасных форм, майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія вывучаюць, пераймаюць і папулярызуюць мастацкую культуру свайго рэгіёну вусным шляхам. Абавязковай умовай удзелу з'яўляецца наяўнасць у калектыве двух-трох пакаленняў удзельнікаў.

Удзельнікі фестывалю будуць прадстаўляць праграмы з твораў свайго рэгіёну: каляндарныя песні (лета) і сямейна-абрадавыя (вяселле), пазаабрадавыя песні, танцы (сольныя, парныя, гуртавыя), скокі, карагоды, гульні, інструментальныя музычныя творы, творы празаічных жанраў, народныя промыслы і рамёствы.

Такім чынам, увага арганізатараў сучаснай сацыяльна-культурнай дзейнасці ў рэчышчы традыцыйнай народнай культуры павінна стымуляваць развіццё рознаўзроставых складаў мастацкіх калектываў, спрыяць стварэнню пры калектывах носьбітаў мастацкіх традыцый падрыхтоўчых груп, наладжванню супольнай рэпетыцыйнай і канцэртна-гастрольнай дзейнасці, правядзенню дасугавых і выхаваўчых мерапрыемстваў. Пры дамах культуры, рамёстваў пажадана стварэнне рамесных майстэрань, наладжванне гуртковай работы, правядзенне семінараў-практыкумаў і іншых форм перадачы ведаў і навыкаў, дзе б ў якасці выкладчыкаў працавалі знаўцы народных традыцый. Наяўнасць некалькіх пакаленняў удзельнікаў як умова ўдзелу ў мастацкіх праектах можа стаць стымулам для стварэння рознаўзроставых складаў. У жывым дрэве мастацкай культуры павінны максімальна спалучацца карані і кроны.

**Спіс літаратуры:**


1. Абрамовіч, А. Пераемнасць культурных каштоўнасцей у сучаснай беларускай вёсцы (на прыкладзе Мётчанскай адукацыйна-выхаваўчай установы «Школа–садок» Барысаўскага раёна Мінскай вобласці) //Dumspirospero—Пакуль жыву, спадзяюся / А. Абрамовіч; аўт. ідэі і уклад. М.А. Козенка. — Мінск : БелДІПК, 2007. — С. 21–27.
2. Абрамовіч, А. Традыцыйная культура і дзеці // Народная спадчына бацькаўшчыны : матэрыялы фальклорных чытанняў. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2002. —С. 60–68.
3. Афіцыйны сайт фальклорнай групы Guda [Электронный ресурс]. –Режим доступа :http://guda.fromby.net. Дата доступа : 10.11.2012г.
4. Гаваяйновіч, В. Голас роднай зямлі //Афіцыйны сайт аб'яднанай гарадской і раённай газеты «Полацкі веснік»[Электронный ресурс]. – Режим доступа :http://www.pvestnik.by/?p=3608. – Дата доступа 01.11.2012 г.
5. Глушэц, І. Кіраўнік фальклорнага калектыву як транслятар традыцыйнай культуры / І. Глушэц // Аўтэнтычны фальклор : праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзел. VI Міжн. навук.-практ. канф. (Мінск, 27–29 крас. 2012 г.) / БДУКМ ; рэдкал. : Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУКМ, 2012. — С. 143 – 145.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ